ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 134 (1161) | ЧАЦЬВЕР, 12-га чэрвеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

НЯХАЙ ЖЫВЕ БАЛЬШАВІЦКАЯ „ПРАВДА“

XIII зьезд Комуністычнай партыі бальшавікоў Савецкай Беларусі шле палкае бальшавіцкае прывітаньне Цэнтральнаму органу Ўсесаюзнай Комуністычнай партыі—баявой зброі ЦК УсеКП(б) у барацьбе за чыстату генэральнай лініі Комуністычнай партыі—газэце „Праўдзе“,

„Правда“ пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) правяла і праводзіць вялізарнейшую работу па мобілізацыі ўсёй партыі вакол барацьбы супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць „левых“ загібаў і скажэньняў лініі партыі ў колгасным будаўніцтве, якія ўзмацняюць позыцыі правага ўхілу, супроць прымірэнчых адносін да ўхілаў ад генэральнай лініі.

Цэнтральны орган нашай партыі—газ. „Правда“—высока трымае баявы штандар УсеКП(б)—ленінізм.

Газэта „Правда“ зьяўляецца лепшым штодзённым дапаможнікам і кіраўнікам ва ўсёй нашай вялізарнейшай рабоце па соцыялістычным будаўніцтве, ва ўсёй рабоце па выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну, замацаваньню і далейшым разгортваньні калгаснага руху, па выкананьню пяцігодкі за чатыры гады,

Няхай жыве бальшавіцкая „Правда“—баявы орган Усесаюзнай Комуністычнай Партыі!

Няхай жыве перамога соцыялізму ва ўсім сьвеце!

Няхай жыве Ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б)!

На XIII зьезьдзе КП(б)Б

ПЭРЫЁД АД XII ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б—ПЭРЫЁД УПАРТАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Спрэчкі па дакладах т. ГЕЯ і ВАСІЛЕВІЧА аб рабоце ЦК КП(б)Б

У спрэчках па дакладу ЦК КП(б)Б усе выступаўшыя таварышы падкрэсьлівалі правільнасьць палітычнай лініі ЦК КП(б)Б.

У сваёй прамове тав. Адамовіч гаворыць, што „КП(б)Б мае вялікія дасягненьні ў справе эканамічнага і культурнага разьвіцьця БССР. Тыя паказальнікі, аб якіх мы чулі ў дакладзе тав. Гея,—рост народнай гаспадаркі, рост прамысловасьці, пабудова новых фабрык і заводаў, рост соцыялістычнага сэктару ў вёсцы, рост фінансаваньня капітальнага будаўніцтва, рашучая барацьба з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, супроць „левых“ загібаў гавораць аб вялікай рабоце, прароблёнай нашым ЦК. Энтузіязм рабочае клясы за выкананьне 5-гадовага пляну, за разьвіцьцё народнай гаспадаркі ў 4 гады і за выкананьне прамфінпляну таксама гаворыць аб правільным кіраўніцтве БТ КП(б)Б, гаворыць аб правільнай палітычнай лініі Цэнтральнага Камітэту“.

Аб гэтым-жа гаварылі т. Вайман, Лацiс i інш.

Партыя з усёй сілай бальшавіцкасьці біла і будзе біць па беларускім нацыянал-дэмакратызьме

У галіне барацьбы з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, супроць „левых“ загібаў, якія ўзмацняюць позыцыі правага ўхілу, супроць прымірэнчых адносін да іх, у барацьбе з нацыянал-опортунізмам, беларускім нацыянал-дэмакратызмам, КП(б)Б, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, безумоўна, мае вялікія посьпехі.

У сваім выступленьні па пытаньню барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам і яўрэйскім шовінізмам тав. Шпэктараў гаворыць:—Увесь год ад XII зьезду быў годам самай упартай барацьбы за генэральную лінію партыі, барацьбы з нацыянал-дэмократызмам. Тут такія факты, як цэнтральная дыскусія, як выступленьне Жылуновіча, як выключэньне яго з партыі, а ст трох пісьменьнікаў, барацьба з гэтымі фактамі, вылазка ў часе пяцігодзьдзя БДВ, зьмяненьне кіраўніцтва БДВ, дыскусія аб мове, рэзкі ўдар па нацыянал-дэмократу Лёсіку і кампаніі—гэта, бясспрэчна факты, якія гавораць аб тым, што ЦК за ўвесь мінулы год вёў самую актыўную і рашучую барацьбу з нацыянал-дэмократызмам. Тут тав. Араншам сказаў, што нацыянал-дэмократызм ня вош, яе кнурам не раздушыш. Гэта трэба было яму ўлічыць, калі ён аб гэтым гаварыў. Мы мелі ня спуск на тармазы ў справе барацьбы з нацыянал-дэмократызмам а мы мелі, бясспрэчна, нязслабны ўдар, і са дня на дзень, па нацыянал-дэмократызму. Мы зараз на фоне абвастрэньня клясавай барацьбы бясспрэчна, будзем мець ажыўленьне ўзмацненьня нацыянал-дэмократызму ў нашай краіне. І партыя пад кіраўніцтвам свайго ЦК будзе біць, як і біла, з патройнай сілай па контррэволюцыйным беларускім нацыянал-дэмократызьме, па шовінізмам усіх масьцей.

Мы, на аснове асобных перагібаў у падатковай палітыцы, на аснове асобных перагібаў у адносінах да мястэчка, маем ажыўленьне яўрэйскага шовінізму, але нельга абагульваць асобныя перагібы ў агульную лінію ў агульную концэпцыю, якую нібы праводзіць наш ЦК партыі. Гэта няверна, гэта трэба рашуча асуджаць.

Факт ажыўленьня яўрэйскага шовінізму мы маем на шэрагу вучасткаў і, бясспрэчна, будзе правільным, калі наш зьезд запіша аб неабходнасьці большага ўзмацненьня барацьбы з яўрэйскім шовінізмам“.

Аб барацьбе з нацыянал-дэмократызмам і яўрэйскім шовінізмам гаварыў т. Вайман і інш.

Па-бальшавіцку крытыкаваць допушчаныя памылкі

Вялікая ўвага ў спрэчках аддавалася друку. Выступаўшыя дэлегаты адзначылі значную ролю газэты „Зьвязда“ ў барацьбе з нацыянал-дэмократызмам (Хлебнікаў і інш.). Побач з гэтым, дэлегаты паказвалі на пасобныя памылкі нашага друку: „я лічу, што шэраг нашых арганізацый у тым ліку і рэдакцыя газэты „Зьвязда“ недастаткова крытыкавалі свае памылкі. Вазьмеце, напрыклад, „Зьвязду“, калі яна рабіла памылкі, лык гэтыя памылкі пасяліся грамадным лёзунгамі, але калі трэба было гэтыя памылкі пабальшавіцку крытыкаваць, то тут у „Зьвязды“ не хапіла духу крытыкаваць з такім энтузіязмам свае памылкі, як мы гэта робім у сучасны момант. Мы ня бачым дастатковай крытыкі з боку нашага кіруючага органу друку—„Зьвязды“ у адносінах сваіх уласных памылак“—кажа тав. Крылоў.

Аб неабходнасьці павышэньня марксысцкай адукацыі комуністых гаварылі тав. Агульнік і Лацiс.

Падрыхтоўка кадраў для вёскі—важная задача дня

Вялікую ўвагу ў сваіх выступленьнях дэлегаты ўдзялілі пытаньню падрыхтоўкі партыйных кадраў, у асаблівасьці для вёскі. „Ужо ня раз канстатавалася,—кажа тав. Сысоеў,—што батрацка-бядняцкія масы вёскі значна выраслі і часамі стаяць па свайм разьвіцьці вышэй некаторых вясковых комуністых. Гэта патрабуе неадкладных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы вясковых комуністых для далейшай работы па ажыцьцяўленьню задач партыі на вёсцы“. Аб гэтым-жа гаварыў і тав. Кроман.

Пытаньне ваенізацыі рабочых, комсамолу, працоўных мас сялянства заслугоўвае самай сур'ёзнай увагі. Да гэтага часу справа ваенізацыі была пастаўлена дрэнна і таму ў будучым нашы мясцовыя партыйныя організацыі, як у горадзе так і ў вёсцы, павінны ўзмацніць сваю работу па кіраўніцтву ваенізацыяй працоўнага насельніцтва (з прамовы тав. Кудзякова).

Аб неабходнасьці палепшаньня культурна-бытавых умоў і павышэньня рэальнай зарплаты рабочых, гаварылі т. т. Вайман і Гофман.

Адказ ад імя зьезду на прывітаньне колгасьнікаў Клімаўшчыны

Прамова т. Хацкевіча

Таварышы, мне думаецца, што я выкажу агульную думку дэлегатаў зьезду, калі скажу, што мы з асаблівым здавальненьнем заслухалі прывітаньні першых піонэраў масавай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у БССР—колгасьнікаў Клімаўшчыны.

Клімаўшчына ў сэнсе колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ішла і ідзе ўперадзе за іншыя раёны БССР. Там зараз колектывізавана звыш 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну.

Таварышы, колгасьнікі Клімаўшчыны. XIII зьезд Комуністычнай Партыі бальшавікоў Беларусі зараз займаецца падагуленьнем вялізарных дасягненьняў соцыялістычнага будаўніцтва ў галіне разьвіцьця прамысловасьці БССР, у галіне соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі. Зьезд вызначае далейшыя шляхі соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. У справе соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі КП(б)Б і надалей, выпраўляючы памылкі, будзе праводзіць на падставе поўнай добраахвотнасьці масавую колектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак нашай рэспублікі, што дасьць нам магчымасьць на базе суцэльнай колектывізацыі ажыцьцявіць лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Пры практычным праводзеньні колектывізацыі вёскі мы мелі шмат памылак, перагібаў і скажэньняў правільнай лініі партыі. Пры наяўнасьці перагібаў, паасобных выпадкаў посьпехаў кулацкай агітацыі і ўплыву на працоўных жанчын-сялянак асабліва там, дзе мы недастаткова праводзілі работу з беднатой, мы мелі часовы адліў з колгасаў. Таму, таварышы, мы скажам словамі т. Сталіна аб тым, што дрэнна робяць тыя бедннякі і серадняк, якія выходзяць і кідаюць колгасы. Адзіны правільны шлях бедняку і серадняку—ісьці ў колгас. Толькі колгасная гаспадарка ўзьніме на належную ступень сельска-гаспадарчую вытворчасьць, толькі колектыўная гаспадарка палепшыць матар'яльнае і культурнае становішча батрацка-серадняцкіх мас, толькі колектыўная гаспадарка сапраўды зьявіцца сродкам бытавога палепшаньня, бытавога разьнявольненьня працоўных жанчын, батрачкі, бядначкі і серадначкі.

Таварышы, дэлегаты ад колгасаў, перадайце шчырае прывітаньне ад XIII зьезду Кампартыі бальшавікоў і найлепшае пажаданьне посьпехаў працы колгасьнікам „Ленінскі Шлях“, „Комунар Магілеўшчыны“, а ў іх асобе ўсім колгасьнікам Клімаўшчыны і Магілеўскай акругі. Замацоўвайце і пашырайце колгаснае будаўніцтва. Трымайце сувязь і прыцягвайце да колгасаў беднату і серадняцтва-індывідуальнікаў.

Няхай жыве і разьвіваецца соцыялістычная рэконструкцыя сельскай гаспадаркі.

Няхай жыве Ленінская Комуністычная партыя. (Воплескі).

Падарунак менскіх чыгуначнікаў XIII зьезду

10 чэрвеня чыгуначнікі Менску ў падарунак XIII зьезду КП(б)Б і надыходзячаму XVI зьезду ЎсеКП(б) адрамантавалі адзін цягнік, тры пасажырскія вагоны і 18 таварных.

Дэлегаты XIII зьезду перадалі прывітаньне чыгуначнікам, якія абавязваюцца пяцігодку выканаць у тры гады. Пасьля мітынгу ўвесь састаў увайшоў у эксплёатацыю.

Дзеньнік XIII зьезду КП(б)Б

Ранішняе пасяджэньне 10 чэрвеня пачалося заключнымі прамовамі т. т. Галадзеда і Рачыцкага.

Для распрацоўкі рэзалюцыі па дакладах т. т. Галадзеда і Рачыцкага зьездам абрана камісія ў наступным складзе: т. т. Галадзед, Рачыцкі, Чарвякоў, Балцін, Міцькоў, Красоўскі, Ластоўскі, Масюкоў, Дубіна, Караноўскі, Бойка, Караленка, Хатаненка, Ваўковіч, Яфімаў, Боскатаў, Азаронак, Райсін, Юхневіч. Акраменка, Саламонаў, Раманенка, Казлоўскі, Хандогі, Рашотнікаў, Манжалей, Стрыга, Янковіч, Хіваў, Нахільніцкі, Качук, Каржэвіч, Майсееў, Сурба, Сасноўскі, Мяжуеў, Грыбаў, Лацiс, Цімашэнка, Бачароў, Зальдовіч, Сьцяпанаў, Рахманаў, Кухарчін, Шпак, Маркаў, Плюшчаеў, Карпека, Барысевіч і Матус.

На ранішнім пасяджэньні быў таксама заслуханы даклад т. Рыжова аб задачах прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд.

У спрэчках выступілі т. т. Бэрзінг, Кац, Тамкоў, Палачоў, Мазур, Зільбэрман. Аляксееў і Самусенка.

На вячэрнім пасяджэньні працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Рыжова. У спрэчках выступалі т. т. Манжалей, Плятнёў, Калодка, Хаскін, Аскерка і Круглікаў.

З заключнай прамовай на вячэрнім пасяджэньні выступіў т. Рыжоў.

Для распрацоўкі рэзалюцыі па дакладу т. Рыжова зьезд абраў камісію ў наступных т. т.: Рыжоў, Хаскін, Кохан, Левін, Плятнёў, Балцін, Манжалей, Калодка, Саламонаў, Аверын, Захарава, Рэмізэвіч, Вадлоўскі, Гасьперскі, Эпштэйн, Каган, Самусевіч, Гаўруновіч, Катляраўскі, Сапун, Жан, Гофман, Кац, Хасман, Палачоў, Зальдовіч, Піліпёнак, Шпэктараў, Камінштэйн, Шоламаў, Левін, Васкабойнікаў, Шулькін, Супрановіч, Бланштэйн, Альтман, Чорны, Дзяціна, Гэлер, Дзьмітровіч, Грынбэрг, Новікаў, Смаль, Рапапорт і Бэрхін.

А 7 гадзіне вечары адбылася дэманстрацыя піонэраў г. Менску ў гонар XIII зьезду КП(б)Б. Піонэры калектыўна віталі зьезд.

Для адказу на прывітаньні піонэраў зьездам вылучана делегацыя ў наступным складзе: т. т. Галадзед, Араншам, Лацiс, Паляноў, Карпаў, Самойлаў і Гайдуковіч.

На вячэрнім пасяджэньні зьезд вітала таксама дэлегацыя ад зьлёту ўдарных брыгад Дзяржынскага раёну (Гомельшчына). З прывітаньнем зьезду выступіў ударнік т. Цыпкін. Ад камуны „Бальшавік“ зьезд вітаў т. Рушнян ад імя дэлегацыі камунараў.

З адказам на прывітаньні ад імя зьезду выступіў т. Чарвякоў.


Зьездам прыняты прывітальныя тэлеграмы ЦО УсеКП(б) — газэце „Правда“, Камінтэрну і Камуністычнай партыі Польшчы.

Учора працавалі камісіі зьезду.

Чарговае плянарнае пасяджэньне зьезду адбудзецца сёньня а 10 гадз. раніцы ў „Доме Культуры“.

Сталінградзкі трактарабуд

Цэхі Сталінградскага трактарнага гіганта напаўняюцца жыцьцём. У механічна-зборачнай сабраны першы конвэер. У кузьні скончан монтаж двух амэрыканскіх магутных кранаў. Устанаўліваюцца награвальныя печы.



На Зьмену—Інструментальны цэх.

ДЗЕ НЕРАШУЧА ВЫПРАУЛЯЮЦЦА ПЕРАГІБЫ

Лязьнянскі і Самахвалавіцкі РК ЛКСМБ ня здолелі стаць на чале комсамольскіх мас у барацьбе з скажэньнямі партыйнай лініі ў колектывізацыі

Райком не мабілізаваў масы

Усім вядома аб тых перагібах, парушэньнях лініі партыі ў колектывізацыі, якія меліся ў Лязьнянскім раёне, Аршанскай акрузі. Гэта выяўлялася ў насаджэньні комун шляхам адміністраваньня. Па раёну было 16 выпадкаў „раскулачваньня" серадняцкіх гаспадарак. За ўсё гэта зьняты з працы сакратар райкому партыі і распушчан прэзыдыум райвыканкому, некаторыя члены яго аддамы пад суд.

Аднак, комсамольскае кіраўніцтва ня вынесла з гэтага патрэбных вывадаў. Сярод масы комсамольцаў не завострана ўвага на выпраўленьне перагібаў. Для некаторых комсамольцаў, а нават і ячэек у цэлым, як сьнег на галаву, зьявілася аднаўленьне „раскулачаных" серадняцкіх гаспадарак. Ёсьць антысавецкія настроі.

Акрамя таго існуюць яўна палітычна шкодныя настроі: нібы „савецкая ўлада пайшла па лініі найменшага супраціўленьня". Гэтыя настроі ствараюць умовы для ўзмацненьня дзейнасьці правых опортуністых, і гэта дзейнасьць выявілася ў аднаўленьні правільна раскулачаных кулацкіх гаспадарак. Есьць выпадкі, калі комсамолец казанскай ячэйкі Мамыкін выступаў супроць раскулачваньня на базе суцэльнай колектывізацыі. Мамыкін таксама выступаў супроць абагульваньня сродкаў вытворчасьці ў колгасе. Ячэйка КСМ выключыла яго з комсамолу. Райком аднавіў і абмежаваўся вымовай. Мамыкін зараз вышаў з колгасу.

Ёсьць выпадкі, калі колгасы разваліваюцца. Прыкладам гэтага можа служыць колгас імя намесьніка пролетарыяту, у якім налічвалася 7 гаспадарак, з якіх 4 бядняцкія, колгас разваліўся з тае прычыны, што заможная частка гэтай вёскі засеяла адведзеную і ўзараную колгасам зямлю.

Справа аб гэтым накіравана ў райсуд і там марынуецца ўжо два месяцы. Комсамольская ячэйка не ўзялася за гэтую справу і не змагла даць належнага адпору варожым вылазкам супроць колектывізацыі.

У раёне шмат бросавай зямлі, якая нікім не апрацоўваецца. Колгасам апрацаваць яе не пад сілу ў зьвязку з адсутнасьцю рабочай і цяглавай сілы. Па Растоўскім сельсавеце—60 га. бросавай зямлі, па Слабадзкім—40 га і ніводная комсамольская ячэйка у гэтай справе нічога не зрабіла.

Лёзьнянскі райком ЛКСМБ



— Навошта яшчэ тут мабілізоўваць масы(!?)

Баеўская ячэйка складаецца з 20 асоб. У колгасе з іх толькі 7 чалавек.

Колгасьніцы вёскі Вераніцы ўступілі ў соцспаборніцтва, 7 колгасьніц абвясьцілі сябе ўдарніцамі. Баеўская комсамольская ячэйка адмовілася прымаць удзел у соцспаборніцтве.

Вучні школы колгасу імя „Чырвоны Кастрычнік" зьвярнуліся да Растоўскай ячэйкі КСМ аб арганізацыі піонэрскага атраду пры колгасе. Ячэйка адмовіла толькі таму што гэты колгас знаходзіцца ў аддаленасьці 7-мі кілёмэтраў. „Павадыру будзе далёка хадзіць".

Пытаньне сілосаваньня яшчэ не прапрацавана. Ня кажучы ўжо аб комсамольскіх ячэйках, нават райком КСМ не прапрацаваў гэтага пытаньня, ня гледзячы на тое, што Акругкомолам былі дадзены дырэктывы ўжо месяц таму назад. Агракомбінат з сваімі спэцыялістымі—аграномамі не дапамагае комсамолу ў гэтым пытаньні. Агракомбінат абмежаваўся толькі разьмеркаваньнем крэдыту па сілосаваньню.

Прыкладная схема аб перабудове працы ячэек, даслана Аршанскім АК ЛКСМБ, ляжыць у РК КСМ нераспрацаваная. Ячэйкі працуюць па-старынцы. Комсамольскія ячэйкі і асобныя комсамольцы не зьяўляюцца застрэльшчыкамі арганізацыі працы ў колгасах, працы з беднатой і наогул працы сярод моладзі, ад чаго адсутнічае рост арганізацыі. На 1 красавіка г. г. было ў арганізацыі 170 асоб, на 25 мая организацыя вырасла толькі на 17 асоб. Батракоў і сельгасрабочых у организацыі ўсяго 17 асоб.

Комсамольская організацыя, асабліва вясковыя ячэйкі—полупісьменныя. Гэта яскрава сьведчыць праводзімы **політбой**. Па шэрагу ячэек політбой зусім праваліўся, у зьвязку з слабым кіраўніцтвам з боку райкомолу, таксама па раёне правальваюцца і іншыя мерапрыемствы.

Райком КСМ вырашыў стварыць фізвыхаваўчую пляцоўку. Інструктар па фізвыхаваньню дае загад аб мобілізацыі дзьвюх комсамольскіх ячэек мястэчка для працы на гэтай пляцоўцы. Тры разы загад выдаваўся і ніводзін комсамолец ня вышаў на працу.

Газэты „Чырвоная Зьмена", ня гледзячы на праводзімы месячнік, выпісваецца па раёне толькі 30 экзэмпляраў. Ніхто не займаецца справай падняцьця падпіскі на газэту і праверкі, як чытаецца комсамольцамі газэта.

Усе гэтыя факты трэба ўлічыць Аршанскаму акругкомолу і зрабіць належныя захады да аздараўленьня Лядзянскай комсамольскай організацыі.

Іс Курган.

Замест выпраўленьня памылак узводзяць паклёпы на лінію партыі

„Чырвоная Зьмена" на сваіх старонках ужо пісала аб права-опортуністычнай практыцы і „левых" загібаў у працы партыйнай і комсамольскай організацыі Самахвалаўшчыны, але мы прымушаны сёньня констатаваць, што ня ўсюды ў раёне яшчэ і да гэтага часу, як належыць выпраўляюцца гэтыя скажэньні, хоць праўда сучаснае кіраўніцтва парторганізацыі досыць рашуча ўзялося за выкарчоўваньне гэтых памылак.

Асабліва дрэнная справа з выпраўленьнем памылак у Кайкаўскім сельсавеце.

Замест таго, каб прызнаць свае памылкі, кіраўніцтва Кайкаўскага сельсавету і Міхнаўскай партячэйкі тлумачаць свае памылкі гэтак: „У той час, была адна політыка партыі, зараз—другая",—так заявіў сакратар ячэйкі КП(б)Б Хадзюня і інш. Замест выпраўленьня сваіх памылак, людзі з кіраўніцтва паглыбляюць іх, скатваючыся ў балота апартунізму. Пасьля паяўленьня артыкулаў тав. Сталіна, пастаноў ЦК Усе КП(б) і ЦК КП(б)Б яны спрабавалі даводзіць, што „гэтыя пастановы і артыкулы памылковыя, яны ня маюць пад сабою ніякіх падстаў".

Перагібы ў адносінах да серадняка і да сёньняшняга дня ня выжыты. У шэрагу вёсак у сераднякоў забралі палову зямлі і не далі зямлі.

Астраўская ячэйка ЛКСМБ та сама не рэагавала на ўсе скажэньні. Ня лепшае становішча назіраецца і яшчэ шмат у якіх ячэйках.

Замест рэагаваньня, райком ЛКСМБ адносіўся да ўсяго гэтага прымірэнча. Ён стаяў у баку.

Райком комсамолу цалкам і аднагалосна далучыўся да пастановы РК КП(б)Б аб суцэльнай колектывізацыі раёну да вясны 1930 году. Гэтая думка райкомаўцамі праводзілася на ўсіх сходах, аб гэтым даваліся ячэйкам дырэктывы, гэтых памылак райком КСМ да гэтага часу ня выправіў.

Праўдзівы.

Памятка юнкора

Згодна пастановы бюро ЦК ЛКСМБ з 15 чэрвеня пачынаецца справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро ячэек і камітэтаў ЛКСМБ. Пішэце:

1. Як разгортваецца падрыхтоўка да гэтай кампаніі.
2. Як ідзе самаправерка дзейнасьці ячэек, як мобілізоўваюцца масы, як забясьпечана разгортваньне самакрытыкі.
3. Што выявіла гэта самаправерка. Удзел ячэек у гаспадарчым і культурна-нацыянальным будаўніцтве.
4. Становішча кіраўніцтва работай ячэек з боку камітэтаў, а таксама і партыйнага кіраўніцтва комсамольскімі ячэйкамі, наколькі яно адпавядае задачам, якія зараз стаяць перад комсамолам.

Перавыбары саюзных органаў—масавы агляд работы комсамолу

Набліжаюцца тэрміны перавыбараў саюзных органаў. Гэта кампанія мае для саюзу буйнейшае політычнае значэньне, бо яна супадае са сканчэньнем работ XVI зьезду партыі і адбудзецца напярэдадні IX усесаюзнага зьезду комсамолу. Мы будзем падводзіць вынікі амаль трохгадовай работы комсамолу ва ўмовах рэконструкцыйнага пэрыяду, ва ўмовах гіганцкіх посьпехаў соцыялістычнага будаўніцтва і рашучага наступу на капіталістычныя элемэнты ў СССР, з непазьбежным на гэтай падставе абвастрэньнем клясавых супярэчнасьцяў і часовых гаспадарчых цяжкасьцяй у краіне.

З часу VIII зьезду УсеЛКСМ саюз, пад кіраўніцтвам партыі, дабіўся буйнейшых посьпехаў у сваёй рабоце і значна павысіў сваю ролю ў соцыялістычным будаўніцтве.

Саюз няўхільна і цьвёрда праводзіў лінію на разгортваньне бязьлітаснай пролетарскай самакрытыкі ў комсамольскіх організацыях, якая садзейнічае хутчэйшаму выпраўленьню скрыўленьняў партыйнай лініі ў паасобных зьвеньнях саюзу. У гэтай барацьбе саюз ідэёва і політычна вырас і загартаваўся выхаваўшы шырокія масы моладзі ў духу вялічэзнай адданасьці партыі і рэвалюцыі. Аднак, гэтыя посьпехі не зьяўляюцца яшчэ агульнымі для ўсяго саюзу.

Гэтыя посьпехі аказаліся магчымымі таму, што саюз непрымірыма змагаўся з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, з галоўнай небясьпекай—з правым ухілам і з харчуючымі правы ўхіл „левымі" загібамі.

Перавыбарная кампанія павінна яшчэ больш актывізаваць саюз у барацьбе за генэральную лінію.

Перавыбары павінны стаць масавым аглядам работы комсамолу, генэральнай праверкай таго, наколькі хутка ажыцьцяўляецца паварот саюзу ўсёй яго масай, у бок вырашэньня конкрэтных задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Гэта задача можа быць выканана толькі пры ўмове самага шырокага і сьмелага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі на справаздачных і перавыбарчых сходах. У часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі агонь самакрытыкі павінен быць узмоцнен, асабліва на недахопах унутрысаюзнай работы.

Перавыбарная кампанія павінна яшчэ больш узвысіць клясавую баяздольнасьць саюзу, павінна дапамагчы ўсім комсамольцам зразумець рашэньні партыйнага зьезду і належыць практычную дзейнасьць комсамольскіх організацый. Перавыбары саюзных органаў павінны яшчэ больш актывізаваць комсамол у барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі на два франты і асабліва з правай небясьпекай.

Мы павінны патрабаваць ад усіх організацый саюзу самай энэргічнай працы па выкананьню і перавыкананьню промфінпляну, як у яго колькасных, так і асабліва ў якасных паказчыках (зьніжэньне сабекошту, палепшаньне якасьці, павышэньне вытворчасьці працы і г. д.), гэтага можна дасягнуць на аснове далейшага разгортваньня соцспаборніцтва і пераводу яго на вышэйшую ступень праз пагалоўны ахоп рабочай моладзі і дарослых рабочых рацыяналізатарскім і ўдарным рухам.

Трэба забясьпечыць рашучы паварот у працы вясковых організацый саюзу, на аснове няўхільнага выкананьня імі рашэньняў майскага пленуму, у бок разьвязаньня конкрэтных задач соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, узмацненьня колгасаў і далейшага разьвіцьця колектывізацыі.

Комсамольская актыўнасьць у барацьбе за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі павінна быць павышана.

Неабходна, побач з гэтым, забясьпечыць усямернае палепшаньне масавай абаронча-эканомічнай працы сярод рабочых і батрацкай моладзі.

Перавыбарчая кампанія саюзных органаў павінна садзейнічаць масаваму ўцягненьню ў комсамол рабочай і батрацкай моладзі, далейшаму выкананьню 100-процантнага ахопу рабочай і батрацкай моладзі і растлумачэньню ліній саюзу ў пытаньнях росту, павінна садзейнічаць узмацненьню працы па ўцягненьню лепшых комсамольцаў у першую чаргу з рабочых і батракоў, у шэрагі УсеКП(б).

Пад кутом выкананьня гэтых задач трэба праверыць на справаздачных і перавыбарчых сходах працу комсамольскіх організацый, бязьлітасна выкрываючы права-опортуністычную практыку ў паасобных зьвеньнях саюзу, адставаньне хвасьцізм. Разам з тым трэба нанесьці рашучы ўдар па тых элемэнтах, якія яшчэ ўпарта не прызнаюць сваіх „левых" памылак у колгасным будаўніцтве, не жадаюць выпраўляць гэтыя памылкі, не замацоўваюць колгасы, не разгортваюць колектывізацыю і тым самым іграюць на руку кулаку і яго агэнтуры—праваму ўхілу ў партыі і комсамоле.

Пасьпяховае правядзеньне перавыбарчай кампаніі немагчыма бяз шырокага разгортваньня ў Саюзе ўнутрыкомсамольскай дэмократыі. Трэба забясьпечыць поўную магчымасьць для кожнага комсамольца адводу і вылучэньня любой кандыдатуры, сапраўдную выбарчасьць кіраўнічых органаў саюзу і адмовіцца ад складаньня загадзя сьпісаў.

Перавыбарчая кампанія павінна даць аднаўленьне і асьвяжэньне актыву саюзу за лік шырокага і сьмелага вылучэньня на кіраўнічую працу рабочых, батракоў і беднякоў, асабліва дзяўчат. Разам з тым, трэба прыцягнуць да кіраўніцтва комсамольцаў-серадняков, якія давялі на справе сваю беззаветную адданасьць партыі і саюзу. Неабходна забясьпечыць максымальнае ўцягненьне ў кіраўнічыя органы саюзу комсамольцаў-ударнікаў, рацыяналізатараў організатараў вытворчай ініцыятывы моладзі, якія стаяць на чале соцыялістычнага спаборніцтва мас. Росту гэтых новых кадраў актыву і ўзмацненьне пролетарскага кіраўніцтва ў комсамоле павінна ўсямерна садзейнічаць перакідка 500 чалавек кіраўнічага актыву саюзу на сталую працу ў вёску.

На надрыхтоўцы да перавыбараў саюзных органаў, на няўхільным праведзеньні генэральнай лініі партыі, на пролетарскай самакрытыцы, на узмацненьні пролетарскага кіраўніцтва ў комсамоле і павышэньні яго клясавай баяздольнасьці—трэба сконцэнтраваць зараз увагу мас комсамольцаў і моладзі.

М. Цэцэрын.

СУПРОЦЬ УНІВЭРСАЛІЗМУ

ШСМ павінна даць колгасам кадры працаўнікоў масавай кваліфікацыі, організатараў і кіраўнікоў буйной колектыўнай гаспадаркі, гэта-ж патрабуе ад ШСМ перабудаваньня яе працы ў адпаведнасьці з задачамі соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Парыцкая ШСМ ужо зрабіла некаторыя крокі ў галіне рэорганізацыі ШСМ у школе колгаснай моладзі; школа правяла разьбіўку трэцяга курсу на сэкцыі, організавала 3 сэкцыі: садова-гародніцкую, жывёлаводчую, рахункаводаў. Аднак сэкцыі створаны вельмі позна і да сканчэньня навучальнага году ніводная з іх ня мае магчымасьці прапрацаваць сваёй програмы. Навучальныя пляны і програмы амаль зусім не прыстасаваны да задач падрыхтоўкі колгасных кадраў.

Школа і сэкцыі працуюць па програмах і плянах, выданых у 1926 годзе, у якіх ставіцца асноўная мэта: „падрыхтаваць культурнага селяніна індывідуальнай гаспадаркі", карацей кажучы—падрыхтаваць кадры для заможных гаспадарак. Да гэтай-жа програмы і прыстасаваны падручнікі, па якіх школы займаюцца. Новых-жа програм і падручнікаў школы не атрымалі.

Яшчэ горш абстаіць справа з вучобай II-га курсу; там сэкцыі ня створаны і ён займаецца вывучэньнем сельскай гаспадаркі і колгаснага руху наогул. Гэты унівэрсалізм ні ў якім разе ня можа забясьпечыць выкананьня задачы падрыхтоўкі патрэбных кадраў.

Нарэшце, трэба адзначыць вялікі недахоп у агрономічным складзе. Школа мае аднаго агранома настаўніка, які, працуючы на трэцім курсе, ня можа добра абслугоўваць працу I-га і II-га курсу і стала занята пытаньнем распрацоўкі програмы сваіх занятаў, каб не карыстацца „Наркамасьветаўскай", разьлічанай на „культурнага гаспадара".

Практыка вучняў школы выкарыстоўвалася для экскурсіі і працы у колгасе ў час вясеньняй пасеўкампаніі, без належнай увязкі з програмна-дасьледчай працай, а вучні ў колгасах выкарыстоўваліся, як працоўная сіла.

Такая пастаноўка працы прыводзіць да таго, што школы ня маюць выразнай мэтавай установкі,—каго рыхтаваць і для чаго. Праўда, ёсьць установка Наркамасьветы ў програме за 1926 год аб тым, што школа павінна рыхтаваць „культурных гаспадароў", але гэта ў корні супярэчыць дырэктывам партыі, новай-жа програмы і паказаньняў, каб не карыстацца старой програмай, Наркамасьветы ня даў. Як бачыце, ШСМ застаўлена за бартом жыцьця, яна не перабудавалася і не прыстасавала сваёй працы на выкананьне ўскладзеных на яе партыяй і комсамолам задач.

І зусім нічога не зрабіў да апошняга часу Наркамасьветы ў галіне рэорганізацыі школы ШСМ у школы колгаснай моладзі. Школа і надалей засталася без програм і пляну, бяз усякай мэтавай установкі ў сваёй працы.

Мы з усёй катэгорычнасьцю выступаем за безадкладную рэорганізацыю ШСМ.

Пара пакончыць праводзіць „прышчэпаўскую" падрыхтоўку кадраў. Трэба тэрмінова выкінуць з карыстаньня ШСМ програмы і падручнікі, якія не адпавядаюць задачам сёньняшняга дня.

Юнкор з Парыцкай ШСМ
Кліманюк.

У барацьбе за кадры

Уключаемся ў спаборніцтва

„Чырвоная Зьмена“ прымае выклік „Комсомольскай Праўды“ на соцыялістычнае спаборніцтва па падрыхтоўцы і правядзеньню асеньняга набору ў школы ФЗВ

Акругкомы, райкомы, ячэйкі!—адказвайце на выклік „Комсомольской Праўды“

Комсамольскія організацыі Беларусі, прымайце выклік!

ВСНГ зацьверджана канчатковая лічба асеньняга набору ў ФЗВ—135 тысяч. Гэтая лічба мінімальная. Яна і можа быць перавыканана. Аб гэтым гаворыць вопыт прыёму студзеньскага набору ў ФЗВ.

У студзені цэлы шэраг гаспадарчых органаў, праводзячы опортуністычную політыку ў падрыхтоўцы рабочых кадраў, ярасна выступалі супроць лічбы ў 57 тысяч. Прыходзілася тысяча довадаў супроць павялічанага прыёму ў ФЗВ. Ня гледзячы на простае праціўдзейнічаньне з боку гаспадарчых організацый, студзеньскі набор быў перавыкананы. Замест 57 тысяч было набрана 65 тысяч падлеткаў. Больш таго, Украіна, якая здолела мобілізаваць грамадзкую думку вакол ФЗВ, правяла дадатковы майскі набор у 15 тысяч чалавек.

Вось чаму мы з упэўненасьцю можам сказаць, што асеньні набор можа і павінен быць перавыкананы. Само жыцьцё гэтага патрабуе. Разьвёрстка ВСНГ СССР дае рэспубліканскай прамысловасьці РСФСР разьвёрстку ў 40 тысяч чалавек. Загад ВСНГ РСФСР аб асеньнім наборы гаворыць аб лічбе 64 тысячы. Гэта гаворыць аб тым, што лічба устаноўленая ВСНГ СССР, зьяўляецца мінімальнай.

Для таго, каб выканаць і перавыканаць плян асеньняга набору, комсамольскія організацыі павінны правесьці вялікую работу. Трэба сказаць адкрыта, што галоўная адказнасьць за правядзеньне асеньняга набору кладзецца на комсамол.

Мы абвяшчаем спаборніцтва між комсамолам Украіны, Беларусі, Уралу, Ленінграду, Сібіры і Паўночнага Каўказу на лепшае правядзеньне асеньняга набору.

Асноўныя паказчыкі спаборніцтва:

1. Хто даведзе контрольныя лічбы асеньняга набору да кожнага прадпрыемства і ФЗВ.
2. Хто дабʼецца перавыкананьня контрольных лічбаў для данага прадпрыемства ці трэсту.
3. Хто лепш праведзе адбор падлеткаў для ФЗВ.
4. Хто лепш паставіць падрыхтоўку беспрацоўных падлеткаў на падрыхтоўчых курсах.
5. Хто дабʼецца максымальнага выкарыстаньня памяшканьня і абсталяваньня ФЗВ для поўнага ахопу ўсяго асеньняга набору.

У якасьці арбітра, які будзе сачыць за выкананьнем гэтых пунктаў мы прапануем організаваць камісію з прадстаўнікоў ЦК комсамолу, ВСНГ, УсеЦСПС, двух-трох прадпрыемстваў і ФЗВ.

„Комсомольская Правда“.

Чакаем адказу

Да асеньняга набору ў школы ФЗВ засталося мала часу. Між тым, па цэламу шэрагу прадпрыемстваў Беларусі да новага набору яшчэ не падрыхтаваліся і ніякай падрыхтоўчай работы не вядзецца.

Гомельская школа ФЗВ мэталістых да гэтага часу ня мае патрэбных умоў для працы. Гэта ў той час, калі мэталёвай прамысловасьці Гомельскай акругі да канца пяцігодкі патрабуецца 5000 кваліфікаваных мэталістых, калі школа пры сучасных тэмпах працы з цяжкасьцю зможа даць толькі 400 рабочых. Пашырэньне ФЗВ не праводзіцца і патрэбных умоў для пашырэньня школы няма. Такое-ж становішча існуе і па цэламу шэрагу іншых прадпрыемстваў.

У віцебскіх фабзавучах справа абстаіць ня лепш. Дзякуючы адсутнасьці памяшканьня для Будвучу, заняткі ў ім прышлося спыніць на месяц раней тэрміну. У фабзавуч мэталістых мяркуецца прыняць 150 чал., тым часам памяшканьня яшчэ няма. У такім-жа становішчы знаходзяцца ФЗВ краўцоў, панчошнікаў і ФЗВ фабрыкі «Дзьвіна».

Комсамол, які вядзе доўгую і упартую барацьбу супроць гасьцеўскіх форм падрыхтоўкі кадраў, за пашырэньне сеткі ФЗВ, як асноўнай формы падрыхтоўкі кадраў, павінен зараз даць рашучы бой той бясплянавасьці, косвасьці і павольнасьці, якая пануе зараз яшчэ ў справе падрыхтоўкі да асеньняга набору.

Канчаткова зацьверджаная ВСНГ СССР лічба асеньняга набору ў ФЗВ, якая складае па ўсяму Саюзу 135 тысяч, павінна быць ажыцьцёўлена з тым, каб наша прамысловасьць магла атрымаць яшчэ 135 тысяч сапраўды падрыхтаваных кваліфікаваных рабочых соцыялістычнай прамысловасьці.

Вялікую ролю ў гэтай справе, справе падрыхтоўкі да набору павінна адыграць комсамольская організацыя, якая павінна скласьці грамадзкую думку вакол пытаньня падрыхтоўкі да набору і стварэньня належных умоў для працы школ.

„Чырвоная Зьмена“, зьмяшчаючы выклік „Комсомольской Правды“ на соцыялістычнае спаборніцтва па найлепшай падрыхтоўцы да набору, прымае гэты выклік і ўключаецца ў спаборніцтва па гэтаму пытаньню.

Прымаючы выклік „Комсомольской Правды“, „Чырвоная Зьмена“ заклікае ўсю комсамольскую організацыю Беларусі на барацьбу за лепшую пастаноўку вучнёўства ў ФЗВ, за стварэньне сапраўдных умоў, пры якіх маглі-б працаваць ФЗВ і набіраць новыя падмацаваньні.

Гэта соцспаборніцтва павінна ператварыцца ў масавы рух комсамолу і рабочай моладзі на справу дапамогі ў працы ФЗВ і стварэньні патрэбных умоў для ажыцьцяўленьня дырэктывы партыі аб падрыхтоўцы кадраў і выкананьні пастановы ВСНГ СССР аб наборы 135 тысяч.

Мы чакаем ад комсамольскай організацыі Беларусі адказаў на выклік „КП“. Акругкомы, райкомы, ячэйкі! За вамі слова!

Рэдакцыя.

Не адмахвайцеся, а кіруйце

Шэраг Віцебскіх колектываў і райкомы амаль ня кіруюць школамі фабзавучу. Віцебскі АК у адказе за гэта

Надыходзячая конфэрэнцыя фабзавучнікаў павінна сказаць сваё слова, вызначыць шляхі палепшаньня зьместу культурна-выхаваўчай вытворчай работы фабзавучаў

Фабзавуч рыхтуе ня толькі кваліфікаваных работнікаў нашай прамысловасьці, але і грамадзка-політычных разьвітых працаўнікоў. Паглядзім, як у сапраўднасьці віцебская організацыя рыхтуе нашы кадры. Здавалася-б што комсамольскія організацыі павінны быць першымі ініцыятарамі кіраўніцтва фабзавучамі. Але гэта ня так.

Адсутнасьць кіраўніцтва райкомамі, ячэйкамі ЛКСМБ шмат адбіваецца на становішчы фабзавучаў. Шмат недахопаў у політычна-выхаваўчай працы, ёсьць факты антысэмітызму, шовінізму (ФЗВ мэталістых, і швейнікаў), растраты, зладзейства і г. д., фабзайчаты ня ведаюць, што такое прамфінплян. Прамфінплян ніводным фабзавучам Віцебску не даведзен да фабзайцаў. Фабзавучнікі адарваны ад жыцьця прадпрыемства, ня ўдзельнічаюць у яго жыцьці.

Вялікі процант прынятых у ФЗВ складаюць бяспрытульныя. З імі ніякай працы не праводзяць.

Калі я задаў пытаньне сэкратару комсамольскага колектыву панчошнай фабрыкі—тав. Кобрынай—„чаму комсамольская ячэйка ня кіруе фабзавучам, не адчуваецца там ніякай работы“—я атрымаў наступны адказ: „загадчыцай школы зьяўляецца комсамолка-партыйка, дык яна і павінна праводзіць усю грамадзка-політычную працу“. Ці так гэта? Няўжо ў вылучэньні аднаго чалавека выяўляецца ўсё кіраўніцтва? Ці ведае і Кобрына і бюро комсамольскага колектыву аб тым, што некаторыя фабзайцы знаходзяцца на чорнай дошцы, што ў фабзавучы прагулы, спазьненьні на працу, што ў ФЗВ адсутнічае ўсякая крытыка і самакрытыка, што прапановы фабзайцаў застаюцца ляжаць спакойна пад сукном, што вытворчае навучаньне пастаўлена з рук вон дрэнна? Што зроблена вамі для зьнішчэньня гэтых недахопаў? Ня ведаеце і нічога не зрабілі.

Або возьмем як і хто кіруе школай мэталістых. Комсамольская ячэйка ФЗВ лічыцца цэхавай ячэйкай пры колектыве ЛКСМБ „Чырвонага мэталістага“. Кіраўніцтва ячэйкі выяўляецца толькі ў тым, што сэкратар колектыву т. Гольдзін, часам заходзіць у ФЗВ. У апошнія часы ў у гэтым фабзавучы мелі месца вылазкі антысэмітызму і шовінізму. Антысэміцкіе слоўцы былі сыстэмай для гутарак некаторых фабзайцаў. Лаянка, хуліганства зьяўляецца частым госьцем у фабзавучы. Дзяўчына-фабзавучніца ня можа зайсьці ў ліцейны цэх з-за ганебнай лаянкі. Калі аб усім гэтым разьбіралася на зачыненым сходзе комсамольцаў, запрошаны сэкратар колектыву мэтпрому ня прышоў. Праўда, вылючылі на гэтым сходзе за антысэмітызм Суранава, але ня ў гэтым-жа справа а справа ў тым, каб зараз-жа наладзіць грамадзка-выхаваўчую працу ў ФЗВ мэталістых, таму што з гэтым вельмі дрэнна.

Партыйнае кіраўніцтва фабзавучам зусім не практыкуецца, няма партпрымацаваных да комсамольскіх ячэек. Сэкратар партыйнай ячэйкі «Чырвонага Мэталістага» ня ведае зусім аб існаваньні фабзавучу. Калі сэкратар комсамольскай ячэйкі ФЗВ мэталістых пачаў яму гаварыць аб працы фабзавучу, паследвала такое запытаньне: „Аб якім фабзавучы ты гаворыш, хіба ў нас ёсьць фабзавуч?

Фабзайцы швейнікаў ніколі ня бываюць на сходах рабочых, ня ўдзельнічаюць ва ўсім жыцьці прадпрыемства, нават саюз ня ведае аб іх існаваньні. Школы, знаходзячыся па-за прадпрыемствамі, варацца ў сваім саку, ніхто туды не заглядае.

Пара ўжо, каб комсамольскія і профэсыянальныя організацыі зразумелі, што фабзавучы рыхтуюць ня толькі высока-кваліфікаванага, але і політычна разьвітога рабочага.

Акругком комсамолу, за табою слова!

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“ Бэрнштэйн.

Р. Г. Тыдні два таму назад віцебскі акругком комсамолу рашыў абсьледваць тры фабзавучы ў сувязку з надыходзячай (13 чэрвеня) агульна - гарадзкой конфэрэнцыяй фабзайцаў.

Вынесьлі пастанову, падабралі людзей, якім даручылі абсьледваньне разгарнуць як мага шырэй, організаваць у фабзавучах самаправерачныя брыгады і г. д. Сумленна ўзяўся за працу толькі адзін таварыш, які быў прымацаваны да фабзавучу панчошнікаў. Але працаваў ён толькі два дні, бо зараз акругком яго адклікаў. Астатнія таварышы да работы не прыступілі.

Пад шыльдай фабзавучу--індывідуальнае вучнёўства

Зьмяніць вытворчае навучаньне ФЗВ панчошнікаў

Толькі 4 з пал месяцы таму назад, па настойлівасьці комсамолу і іншых організацый, організавалася школа ФЗВ.

Панчошная фабрыка зараз адчувае недахоп у кадрах, і недарма намесьнік дырэктара фабрыкі заявіў, што яны дрэнна зрабілі, не організаваўшы два гады таму назад фабзавучу. ФЗВ не задаволіць увесь попыт на кваліфікаваных рабочых.

Адразу кідаецца ў вочы, калі заходзіш на фабрыку, у цэхі, дзе працуюць фабзайцы, дрэнная пастаноўка навучаньня. Кожны фабзавучнік прымацаваны да работніцы, якая „навучае“ фабзайца (?). Ці не напамінае гэта вам індывідуальнае навучаньне. Па-мойму, гэта так. Розьніца толькі ў тым, што яны праходзяць тэорэтычныя веды. Гэтымі днямі сход фабзайцаў, сумесна з інструктарскім пэрсоналам, выказаўся за зьмену мэтадаў навучаньня. Сход выказаўся за тое, каб у кожным цэху быў асобны інструктар, які ўвесь час павінен будзе навучаць фабзайцаў, як гэта робіцца ва ўсіх фабзавучах Савецкага Саюзу.



Комсамолец-фабзавучнік за работай

Цікава, што аб гэтым і раней ня раз гаварылі фабзайцы, але адміністрацыя ня цікавілася. Прапановы фабзайцаў засталіся пад сукном. Адміністрацыя і цяпер выказваецца супроць зьмены мэтадаў навучаньня, **мотывуючы тым, што зараз няма ніякіх магчымасьцяй вылучыць інструкароў (!?) адпусьціць машыны выключна для ФЗВ і г. д.**

Фактычна ФЗВ панчошнікаў займаецца не ФЗВ, а індывідуальным вучнёўствам пад шыльдай фабзавучу.

Грамадзкія організацыі і комсамольская ячэйка панчошнай фабрыкі павінны ў хутчэйшы тэрмін заняцца організацыяй сапраўднага фабзавучу.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“ **В. Б.**

За ўдарнікам падцягваюцца ўсе

Віцебскі фабзавуч швейнікаў мае шмат посьпехаў па ўдзелу ў соцыялістычным спаборніцтве. Заключаны дагаворы паміж цэхамі, зьменамі, а таксама агрэгатамі. За ўдарнікамі падцягваюцца і астатнія вучні як на вытворчасьці, так і на вучобе. Насьценгазэта таксама зьяўляецца організатарам соцспаборніцтва, яна рэгулярна выпускае бюлетэнь, у якім своечасова папярэджвае аб недахопах у гэтай рабоце.

На чырвонай і чорнай дошцы ўвесь час вывешваюцца сьпісы перадавікоў і адстаючых, што спрыяе значнаму палепшаньню дысцыпліны. Лепшыя ўдарнікі нядаўна былі прэміяваны месцам на экскурсію ў Ленінград для азнаямленьня з работай ленінградзкіх фабзавучаў. Комсамольская ячэйка школы да гэтага часу мала займалася работай фабзавучу і толькі зараз зрабіла некаторы крок наперад.

Зараз вядзецца падрыхтоўка да адпускнога вечару і падвядзеньня вынікаў соцспаборніцтва па школе. Самаправерка дала штуршок у падачы заяў беспартыйных фабзайцаў у комсамол.

Аяк.

Эстафэта працоўных дасягненьняў

Да старту засталося 16 дзён

Лепшыя ўдарнікі павязуць рапарты ад БССР ХУІ партзьезду

Мы павінны расказаць ХУІ партзьезду аб нашых дасягненьнях.

Не павінна застацца ніводнай фабрыкі, заводу, якія-б ня выканалі прамфінпляну, ніводнага колгасу, ня выканаўшага пасеўных плянаў, не падрыхтаванага да ўборачнай кампаніі.

Комсамольскія ячэйкі! Помніце: вы павінны мобілізаваць увагу ўсіх рабочых, усіх працоўных сялян для падрыхтоўкі эстафэты, што вы практычна зрабілі для гэтага.

Заводы: „Комунар", Бальшавік, „Энэргія" вы павінны быць уперадзе. Што вамі зроблена?

Усім штабам садзейнічаньня ўсесаюзнай аўта-мота-вэлё эстафэце на тэрыторыі БССР

Загад

Цэнтральны штаб садзейнічаньня ўсесаюзнай эстафэце пры Вышэйшым Савеце фізычнай культуры БССР паведамляе ўсе мясцовыя організацыі і штабы садзейнічаньня, што ім зацьверджаны маршрут, час прыбыцьця і адпраўленьня эстафэты Менск—Масква да канечнага пункту сьледжаньня эстафэты на тэрыторыі БССР.

Старт каманде Менск—Масква—28 чэрвеня—12 г. дню, Пляц Волі.

Прыбыцьцё каманды ў Смалявічы—28 чэрвеня—15 гадз. дню, перадача і адпраўленьне эстафэты—15 г. 30 хв.

Прыбыцьцё ў Барысаў—28-га чэрвеня—19 г. дню—перадача і адпраўленьне эстафэты—19 г. 30 хв.

Прыбыцьцё у Крупкі—29 чэрвеня—10 г. раніцы—перадача і адпраўленьне эстафэты—11 г. раніцы.

Прыбыцьцё ў Талочына—20-га чэрвеня—15 г. дню—перадача і адпраўленьне эстафэты—15 г. 30 хв.

Прыбыцьцё ў Воршу 29-га чэрвеня—19 г. 30 хв.—перадача і адпраўленьне эстафэты 20 г. 30 хв.

Прыбыцьцё ў Дуброўна—30 чэрвеня—5 г. 30 хв. раніцы—адпраўленьне без перадачы эстафэты—6 г. 30 хв.

Прыбыцьцё ў Лады—30-га чэрвеня—8 г. 30 хв. раніцы—адпраўленьне і перадача эстафэты—8 г. 45 хв.

Прыбыцьцё ў Краснае 30 чэрвеня—10 г. 30 хв. раніцы—адпраўленьне і перадача эстафэты камандзе Заходняй вобласьці—11 г. 30 хв.

Перадача эстафэты і рапартоў фабрык, заводаў, колгасаў і г. д. ХУІ зьезду УсеКП(б) павінна праводзіцца на плошчах каля будынкаў выканаўчых камітэтаў. Акругі, праз якія ня будзе праходзіць эстафэта, павінны даслаць рапарты ў Менск, цэнтральнаму штабу садзейнічаньня ўсесаюзнай эстафэты пры ВСФКБ не пазьней 20-га чэрвеня.

У склад каманд для ўдзелу на ўсесаюзнай аўта-мота-вэлё эстафэце неабходна падабраць лепшых вытворцаў-ударнікаў.

Цэнтральны штаб садзейнічаньня ўсесаюзнай аўта-мота-вэлё-эстафэце пры ВСФК Беларусі.

З фото апаратам па Менску

На Менскім хэмфармзаводзе



Настоячнае аддзяленьне

„Чырвоная Зьмена" дапамагла

Па надрукаваным у „Чырвонай Зьмене" ад 8.2 допісу „Чужакі ў Мазырскім БПТ", дырэктар Белпэдтэхнікуму паведамляе, што гр-не Рэўт і Малінoўскі, аб якіх пісалася ў допісе, выключаны з тэхнікуму.

* * *

Па дасланаму ў „Чырвоную Зьмену" допісу „Клясавы вораг дзейнічае" Віцебскі АКК РСІ утворана расьсьледваньне, якім высьветлена, што старшыня Кузьмінскага спажыв. таварыства—Макарэнка Антось сын ўжанкара, адстойваў ад індывідуальнага абкладаньня млынара—кулака Якаўлева. За Макарэнкам наглядаўся шэраг вылазак, калі ён, карыстаючыся сваім партыйным білетам, груба скажаў клясавую лінію, як у часе нарыхтовак, так і ў часе колектывізацыі.

Старшыня Гарадоцкай РЗК заяжджаў да кулака, п'янстваваў і частаваўся. Факты пацьвердзіліся. Усе памянёныя ў допісе асобы зьняты з працы, і аддадзены пад суд.

* * *

Па допісах аб Гомельскай школе ФЗВ прыняты належныя захады за загадчык вучнеўскай майстэрні Шастаковіч, інструктар такарнага цэху Міхайлаў, інструктар кавальнага цэху Бакшын П.—зьняты з працы.

* * *

Па допісе „Гомель, вуліца Канева" зьмешчаным у № 286 „Ч. З." за 29 год ад 16 сьнежня, бухгальтар працколектыву Дудкін зьнят з працы і выключан з саюзу, загадчык майстэрні —Жыленка з працы зьнят,

* * *

У выніку допісу Прапанована заматчаць , зьмешчанага ў „Чырвонай Зьмене № 278, за 1929 год, аб 7 гасьнежня за заціск самакрытыкі, Сяргеенка Я. зьнят з працы і выключан з партыі. Папсуева і Даўгулёў Л. выключаны з шэрагаў партыі. Пэсінай вынесена суровая вымова

* * *

Па допісе—„Бюрократы забілі вытворчую комуну , зьмешчаным у № 63 „Ч. З." за 1930 год, організатар комуны тав. Саколін на працы адноўлен рашэньнем працэсіі Гомельскага акруговага суда з аплатай пэнсіі за месяц вымушанага прагулу.

* * *

На дасланы ў рэдакцыю допіс пад назваю „Дзіцячая калёнія" Серп і Молат" у дрэнным становішчы была ўтворана камісія.

Загадчык калёніі—Васкабовіч—з працы зьняты.

* * *

Па допісу „сын кулака-актывісты колгасу" Жлобінскі РВК паведамляе, што кулак Бобрыкаў Сьцяпан з колгасу выключан. Пастаноўлена прыцягнуць да адказнасьці „Майскі сельсавет за выдачу несапраўдных вестак.

* * *

Па допісу „Дапамагаюць кулаку" фракцыя ЛКСМ школы рабочай моладзі Горацкага раёну паведамляе, што захаваўшы с аё сапраўднае прозьвішча Варанцоў Макей са школы выключан і прыцягнут да адказнасьці.

„Вынаходзтва" заціскачоў самакрытыкі

Калі-б спытаць у сакратара Чэрвеньскага РВК Бохана, як ён адносіцца да самакрытыкі, дык Бохан пачаў-бы прыблізна так:

— Я самы лепшы прыяцель самакрытыкі, я люблю яе і своечасова рэагую на ўсе допісы, якія „пахнуць" самакрытыкай, асабліва калі яны зьмешчаны ў „Чырвонай Зьмене".

— Вось вам прыклад: калі 17 мая ў «Ч. З.» быў зьмешчаны допіс аб заціску самакрытыкі ў Хутарскім сельсавеце, дык я першы на яго рэагаваў.

* * *

Сотні юнкораў пішуць допісы. Тысячы балячак ускрыла „Чырвоная Зьмена" на гэтых допісах.

Меткім допісам б'е юнкорыя галавацяпаў, а ў тым ліку бюрократаў і заціскачоў самакрытыкі ў Хутарскім сельсавеце Чэрвеньскага раёну.

„Драгоценным рвением кичимы" сакратар Чэрвеньскага РВК Бохан, пажадаўшы давесьці, што допіс—хлусьня (!?), піша адносіну сакратару кандыдацкай групы Калтовічу, пра якога быў напісан допіс, і які сам зьяўляецца заціскачом самакрытыкі, заяўляючы: „Няма чаго рабіць, дык і пішуць", каб той расьсьледваў, ці сапраўды ён (Калтовіч) заціскае самакрытыку.

Ці-ж гэта не рэагаваньне на юнкораўскі допіс (!?). Толькі „вумная" галава сакратара РВК Бохана магла да такога „рэагаваньня" дадумацца.

Афіцыйнага адказу Чэрвеньскага РВК на допіс юнкора М. Ракіты мы не атрымалі, але мы ўпэўнены, што сэнс адказу будзе такі: „Допіс не адпавядае сапраўднасьці".

Сваім „рэагаваньнем" на юнкораўскі допіс Бохан пакрыў справу і хаця-б допіс на ўсе 100 проц. быў-бы правільным, у яго ўсёроўна—„факты не пацьвердзяцца".

Мы патрабуем ад адпаведных органаў прыцягненьня да адказнасьці Бохана, як заціскача самакрытыкі. Зэбэ.

Апошнія навіны

Да новага навучальнага году

Тэрмін падачы заяў для паступленьня ва ўсе політэхнікумы, тэхнікумы, падкурсы і профшколы, пабудаваныя на базе сямігодкі, устанаўліваецца з 10 па 25 ліпеня. Іспыты і залічэньні будуць вытварацца з 1-га па 10-е жніўня.

У хуткім часе НК Асьветы выпускае спэцыяльны даведчык з правіламі прыёму ва ўсе навучальныя ўстановы Беларусі.

Дом адпачынку—піонэрам

20 чэрвеня ў мястэчку Дукоры (Сьмілавіцкі раён) па ініцыятыве АК ЛКСМБ і ЦБ ДКО адчыняецца акруговы піонэрскі дом адпачынку, які прапусьціць за лета каля 500 чалавек.

Фізкультура

20 чэрвеня Менскі Акруговы Камітэт МОПР'у склікае агульна-гарадзкую нараду актыву МОПР'у па пытаньню аб падрыхтоўцы да дня вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Паведамленьні

У „Кутку катаргі і ссылкі" (клюбу К. Маркса, уваход з вул. Энгельса) організавана Музэй Народнай волі (да 50-ці годзьдзя Нар. Волі). Прымаюцца рабочыя, вучнёўскія і інш. экскурсіі

Энэрга-бюро ВСНГ БССР паведамляе, што для азнаямленьня шырокіх мас працоўных з ходам работ будаўніцтва Асінаўскай ДРЭС для экскурсій устаноўлены наступныя дні: панядзелак, серада і пятніца. У другія дні як экскурсіі, таксама і асобныя экскурсанты дапушчацца ня будуць.

Аб дні высазу экскурсій трэба паведамляць Асінбуд за 10 дзён.

Тэлеграмы

Рост беспрацоўя ў Румыніі

ВЕНА. Беспрацоўе ва ўсёй Румыніі, у прыватнасьці ў вугальнай і лясной прамысловасьці, непарыўна ўзрастае і прымае пагражаючыя разьмеры. У вугальным раёне Рэшыца рад капальняў спыніла працу з прычыны перавытворчасьці. З 1 чэрвеня каля 1000 рабочых ужо разьлічаны. На капальнях Куманэшці звольненыя рабочыя адмовіліся пакінуць месца працы. Прадпрыемцы выклікалі фашысцкія банды, якія сілком зьнялі рабочых.

Газэта профопозыцыі ў Аўстрыі

ВЕНА. 15 чэрвеня выйдзе першы нумар газэты рэволюцыйнай профопозіцыі Аўстрыі „Пролетары". Сродкі для выданьня газэты былі сабраны сярод рабочых.

Наступленьне капіталу ў Фінляндыі

ГЕЛЬСІНГФОРС. Гельсінгфорскае гарадзкое самакіраўніцтва пры поўным падтрыманьні соцыял-фашыстых, прыняло пастанову аб значным зьніжэньні дапамогі беспрацоўным у летні час і аб заханьні аб'ёму грамадзкіх работ. Апіраючыся на гэтую пастанову, гельсінгфорская гарадзкая ўлада перайшла ў рашучае наступленьне супроць рабочых. Так, за апошні тыдзень з дзяржаўнай судабудаўнічай верфі ў Катаянокка (Гельсінгфорс) звольнена 80 рабочых. Пачаліся звальненьні рабочых з грамадзкіх работ. К 1 ліпеня будзе звольнена 900 рабочых. Рабочым, якія застаюцца на рабоце, заработная плата зьніжаецца на 20-30 проц.

Забастоўка на Рыльскім вадаправодзе

ВЕНА. Забастоўка рабочых Рыльскага вадаправоду цягнецца ўжо другі тыдзень. Рабочыя другога будаўнічага вучастку, якім праўленьне, з мэтай раскалоць бастуючых, абяцала выканаць патрабаваньні, спынілі было на два дні забастоўку, на 29 мая ізноў забаставалі.

Праўленьне імкнецца зламаць забастоўку шляхам фашысцкага і паліцэйскага гвалту. На месца забастоўкі адпраўлены атрады фашыстых з „Роднай Абароны", пад прадлогам аховы пабудоў. Прыбыў таксама начальнік паліцыі, які імкнуўся запалохаць рабочых і абвясьціў забастоўку закончанай. Аднак ніхто з бастуючых на работу ня вышаў. Паліцыя арыштавала басковачны камітэт, але на яго месца зараз-жа стаў новы камітэт. Забастоўка працягваецца.

23 чэрвеня—міжнародны дзіцячы зьлёт

Разьвёрстка месц для дэлегатаў СССР

ЦК УсеЛКСМ зацьвердзіў наступную разьвёрстку месц на міжнародны дзіцячы зьлёт у Гальле (Нямеччына): Масква—2, Ленінград — 2, Украіна (Харкаў, Донбас)—2, Урал—1, Ніжняя Волга—1, Сярэдняя Волга—1, Закаўказье—2, Сярэдняя Азія, Туркестан, Узбэкістан—2, Беларусь—1, Паўночны Каўказ — 1, Сібір—1, ЦЧО—1, Іванава-Вазьнясенск—1, Ніжагародзкі край—1, Казакстан—1, Заходняя вобласьць—1.

Акрамя таго, два месцы прадстаўлены для кіраўнікоў дэлегацыяй СССР.

Організацыі, атрымаўшыя месцы на зьлёт, абавязаны забясьпечыць выбары сапраўды актыўных піонэраў, якія даказалі адданасьці організацыі. Выбары правесьці на краёвай (рэспубліканскай) конфэрэнцыі па інтэрнацыянальнаму выхаваньню.

ЦК УсеЛКСМ прапануе комсамольскаму і піонэрскаму друку правесьці шырокую кампанію, якая-б растлумачыла значэньне зьлёту, парадак выбараў дэлегатаў, абгаварэньне кандыдатур пасылаемых, а таксама даваемых ім наказаў і г. д.

Сэкратар ЦК УсеЛКСМ **Косараў**

Плешчаніцкі РК ЛКСМБ сваёй бязьдзейнасьцю зрывае важнейшыя гаспадарча-палітычныя мерапрыемствы

(Па тэлефону з Плешчаніцы)

Плешчаніцкі РК ЛКСМБ па сілосаваньню кармоў нічога конкрэтнага не зрабіў. Праводзіліся нарады, пішуцца цыркуляры, а да працы ніводная з ячэек не прыступіла.

Мясцовыя актывісты і кіраўнікі лічаць, што нейкі „чудак" выдумаў кожнай ячэйцы пабудаваць 35 сілосных ям. Комсамольцы-колгасьнікі ніякай працы ў колгасе па пабудове сілосных ям не праводзяць. Па шэрагу колгасаў пасеў сілосных культур і будаўніцтва сілосных ям правальваецца.

Пытаньне ўборачнай кампаніі РК ЛКСМБ не абгаварвалася і ўся комсамольская організацыя ў падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі бязьдзейнічае.

ГЕЛЬФМАН.

Адказны рэдактар Рэдколегія

Згублены:

— Комсамольскі білет за № 71181, выд. АК ЛКСМБ і сябр. кніжка за № 146927, выд. ЦП саюзу друкароў на імя Мельцера Х. С.

— Пасьведчаньне імя Левіна Я. І., выд. Мен. політэхнікумам.

— Пасьведчаньне на імя Кандратава А. З., выд. Мен. політэхнікумам.

— Пасьведчаньне на імя Сівака М. А., выд. Мен. аб'яднанай профшколай.

— Біржавая картка за № 4439 на імя Грынгауза М. С., выд. юнсэкцыяй біржы.

— Біржавая картка за № 4075 на імя Левіна Л. І., выд. юнсэкцыяй біржы.

— Біржавая картка на імя Казлоўскага К. Л., выд. юнсэкцыяй біржы працы.

— Залікавая кніжка № 259 на імя Дзюніпіна А. С., выд. Мен. Дзяржполітэхнікумам.

Адзначаныя дакументы лічыць несапраўднымі.

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599